БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права направуляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рубля.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб
на зпошний—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 44. Менск. Пятніца 17 мая 1918 г. Год I

Менск 17/V.

Згодна з Берасьцейскай умовай, каторую ад імені «савецкай Расіі» з расійскаго боку праводзіу Слуцкі інтэрнацыяналіст «таварыш Троцкі», Беларусь, пазбауленая тады магчымасьці падаць свой голас, аказался падзеленай на часьці.

Беларускія часьці Віленшчыны і Гродзеншчына, часьці Менскай губ., апыніліся за лініяй за каторую ні павінны больш сягаць інтарэсы «Вялікай» Расіі. Землі прылегаючыя да Украіны адыходзяць да гэтай дзержавы, а рэшта Міншчыны і Магілеушчыны, беларуская Смаленшчына і Віцебшчына як «Великорусскія» землі асталіся на паток, грабунак распараджэнпе монголофінскай зьмеі чалавецтва, якая абвесьціла «новую эру» для усяго сьвету—Вялікаросіі.

Нас гэты падзел аднак ні страшыць.

Дзевяцісотыя годы абудзілі на Беларусі народ, каторы тым мацней будзе ісьці да сваіх правоу, чым болей перашкод спаткае на свaей дарозе.

Акт выданы 9 сакавіка г. г. Радай Першаго Усебеларускаго Зьезду абвесьціу Беларусь Народнай Рэспублікай Акт 24 сакавіка праклямавау нізалежнасьць.

Прауда за імі ішчэ німа той сілы, каторая надаецца надобным актам міжнародным прызнаннем, ні хаця прызнанием з боку групы дзержавау як напрыклад Украінская Народная Рэспубліка атрымал прызнаннє Нямеччыны і хаурусных з ею дзержавау й. Літва, нізалежнасьць каторай прызнана аднэй Нямеччынай.

Але часць безспрэчнай праўнай моцы за актамі 9 і 24 сакавіка есьць. Гэта першае з боку агульнаго права народау на самаазначэнне, права прызнанаго і Нямеччынай і Вялікаросіяй,—пастановы 1 з'езду і тыя уповажнения якія ен дау Радзе; другое—тая дэклярацыя расійскаго большэвіцкаго ураду каторай за народамі населяючымі Расію прызнаецца права, ні толькі на самаазначэнне, але на поунае нават аддзяленне.

На моцы гэтай дэкляраццыі памяпеныя акты Рады *маюць ужо* за сабой юрыдычнае прызнанне Вялікаросіі і абавязковы характар для усей, Берасьцейскаю умоваю астауленай пры Расіі, часьці Беларусі т.е. Меншчыны (ні усей) Магілеушчыны, Віцебшчыны, беларускай Смаленшчыны і часьці Віленшчыны.

На усей гэтай тэрыторыі—Нізалежная Беларуская Народная Рэспубліка можа найважнейшай задачай новаго беларускаго ураду, формірованне, якога Рада даручыла грамадзяніну Р. Скірмунту, — дабіцца для Беларусі ад Вялікарускаго ураду формальнаго прызнания, умоцауванаго пэунымі дагаворнымі дакумэнтамі, Нізалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі, каторая цяпер тэрыторыяльна, пакуль што, уходзіць у склад «Русской федеративной Соціалістической» рэспублікі.

Трэба спадзевацца, што пры гэтым новаму ураду удасцца знайсці сілы на якія Беларусь здолае аперціся у сваіх дамаганнях у Вялікаросіі.

Абразкі с правінцыі. *)

III.

З Дзісеншчыны.

Нападкаў я цікаўны дакумант: на поў аркушы паперы зьверху тры слупкі друку—па нямецку, па польску і па беларуску; ў нізе і другая старана паперы разьлінована на тры часткі: у першай—пішыцца імя і прозьвішчо, у другой—дзе жыве, у трэцяй—подпіс; з боку-на перадзі—нумаровы парадак.

Надруковано вось што: «Мы ніжэй падпісанныя адвечныя жыхары Віленскай губ. у часьці яе нідаўна акупірованай (паветаў Вілейскаго, Дзісненскаго і часьцін Ашмянскаго), уратаваныя і аддзяленыя германскім войскам ад анархіі вялікаросійскаго большэвізма, вельмі хочэм, каб гэта аддзяленне было назаўсягды і каб нашi паветы былі далучэны да рэшты Віленшчыны з яе прадвечнай сталіцай Вільняй, з каторай наш край звязан у адно цэлае праз рэлігійныя, культурныя і гаспадарскія справы, бо толькі пры гэтых варунках мы можэм быць пэўнымі, што заходня—эўрапэйская культура у нас умацуецца і разаўецца.

У квіетні 1918.»

Спісаў я гэты дакумант даслоўна, ні зьменяючы нават правопісу. Гэткія паперкі вельмі распаўсюджаны па Віленшчыне; подпісы зьбіраюцца ішчэ і цяпер старанна і ахвотнікаў падпісывацца дужа многа. Найбольш далучаюцца да гэтаго земляўласьнікі двароў, фальваркаў і малых хутароў, а так сама амаль ні ўся дробная шляхта, нават беззямельная і жыхары нашых мястэчак.

З вясковымі селянамі справа гэта ідзе ні так шпарка Цяпер наш селянін да ўсяго новаго, мала яму зразумелаго адносіцца з вялікай падаэрoнасьцю і асьцярожнасьцю. Патайных думак сваіх нівыказывае нават свaім найбліжэйшым, шчырых слоў—дарэмна ад яго спадзевацца і той, хто паверыў бы лёгка гутарцы з нашым селянінам цяпер—вельмі ашукаўся-б.

Наскольки цяжкі, трудны,—настолькі важны і атветны момант для тых, хто думае падыйсьці цяпер бліжэй да нашаго селяніна і хто хоча павясьці яго за сабой. Трэба зразумець і памятаць, што ў гэты час ніякі селянін, а тым больш селянін-беларус ніякім пекным словам і абецанкам ні паверыць. Трэба хутчэй, ніадкладна брацца хаця б за падгатоўку да тэй работы, з якой была-б відаць вачавідная карысьць для селяніна. Гэткая работа адна толькі і ёсьць і вы яе ведаіце:

Зямельная рэформа.

Я. Ш.

*) Гл. № 39,—з дарогі і 43,—Абразкі с пр. II.

На беларускім шляху.

14 мая у Радзе Беларусі.

Пасядзэнне Рады Б. 14 гэтаго мая мело надта важны характэр, ні глядзя, што на ім ні было ані гарачых прамоваў, ані спрэчак. Ім як бы закончыўся першы пэрыод рэорганізацыі Рады і яе установаў, прынята адстаўка Народнаго Сэкрэтарыяту першаго складу, згодна з новай групіроўкай сілаў адбыліся перавыбары Старшыны (прэзыдыўму) і даручано форміраванне новаго складу Народнаго Сэкрэтарыяту аднэй асобе, чым ўводзіцца ў жыцце праэкт старшыні узяўшаго адстаўку складу сэкрэтарыяту аб формірованні Народн. Сэкрэтарыяту па габінэцкай сыстэме.

Сход Рады адчыніўся у 6 гадз, пасьля поўдня.

Пасьля зацьверджэння дзеннаго парадку, Старшыня Рады п. Серэда агласіў пастанову Рады старэйшых аб прыняцці адстаўкі Народнаго Сэкрэтарыяту каторы падаў сваю просьбу 12 красавіка.

Старшыя Сэкрэтарыяту, Я. Варонка узяў пасьля гэтаго голас і нарысаваў перад Радай, той шлях, па якому прыходзілося ісьці Народнаму Сэкрэтарыяту у сваёй трох-мясячнай працы і паведаміў аб скутках гэтай цяжкой працы.

Прамова п. Я. Варонка выклікала выступлення прамоўцаў ад фракцыяў Рады. Ва ўсіх прамовах сытўацыя, пры якой працаваў Народны Сэкрэтарыят, прызнавалася ні лёгкай, і былі адзначаны заслугі старога складу Сэкрэтарыяту.

Падачай галасоў пастанова рады старэйшых аб прыняцці адстаўкі старога складу Народнаго Сэкрэтарыяту зацьверджаецца.

Усьлед за гэтым Старшыня Рады аглашае другую пастанову рады старэйшых: аб даручэнні форміравання новаго складу Народнаго Сэкрэтарыяту члену Рады грамадзяніну Раману Скірмунту (цэнтр).

Радны А. Смоліч ад імені рады старэйшых просіць зацьвярдзіць пастанову.

Пасьля кароценькіх дэбатаў над прапазыцыяй, якую ад імені беларускіх с.-р. уносіць **радны Грыб** каб Рада выдзеліла камісію якая апрацавала бы праграму чыннасьці для Народнаго Сэкрэтарыяту, прапазыцыя адкідаецца і зацьверджаецца пастанова рады старэйшых, на моцы чаго члену Рады грамадз. Раману Скірмунту даручэно сформіраваць новы склад Народнаго Сэкрэтарыяту.

Чароднае пытанне,—выбары Старшыны Рады Б. (прэзыдыўму).

А. Смоліч паведамляе Радзе аб пастанове рады старэйшых часова адступіць ад ранейшай пастановы Рады, па якой Старшына складаецца з 7 чалавек і у яе уходзяць прэдстаўнікі меньшасьцяў. Рада старэйшых просіць часова прыняць склад Старшыны с 5 чалавек ні ўводзячы ў яе прэдстаўнікоў ад меньшасьцеў.

Пасьля зацьверджэння гэтай пастановы Рада Беларусі стопнёва больш як $^5/_6$ агульнай лічбы галасоў пры маленькай лічбе устрымаўшыхся (белар. с.-р.) і ні водным праціўным выбірае патаемнай падачай голасу новы склад Старшыны.

Выбраны: старшынёю гр. Язэп Лёсік (кандыдат соцыяліст. аб'еднання); Таварышамі—А. Смоліч (канд. соц. аб'ед.) і А. Уласоў (кандыдат цэнтру); пісарамі—Н. Крэчэўскі (канд. соц. аб.) С. Ленкоўскі (канд. цэнтру).

Заступаючы на мейсцо Старшыні радны гр. **Я. Лесік** у сваёй аддзячнай за ушанаванне выбарам яго прамове сказаў ніжэйшае;

«Дазвольце высокія паны Рада падзякаваць за гонар, аказаны мне. Прыймаючы абавязак Старшыні я буду старацца ісьці разам з Вамі маючы на увазі толькі добрабыт Беларусі, каторы я разумею у гаспадарчым і культурна-нацыянальным яе развіцці, што магчыма ядына пры нізалежнай дзяржаўнасьці. Разам з Вамі гару я адным

бажаннем, каб гэто мейсцо— Высокая Рада—заняла сабе тоя становішчо як рэяльная сіла у між—дзержаўным жыцці, каторае гэтак патрэбно нашаму векамі прыгнятанаму многапакутнаму Беларускаму народу!»

Выбарамі Старшыны закончыўся дзенны парадак пасяддзэння Рады і пасьля прыняцця сроку чароднаго пасядзэння у суботу 18 мая старшыня аб'явіў сход зачыненым.

Як мы даведаліся новы склад Народнаго Сэкрэтарыяту ужо больш менш пэўна намечаецца такі: Старшыня Народнаго Сэкрэтарыяту і сэкрэтар міжнародных і ўнутрэных справаў гр. Р. Скірмунт, Таварыш старшыні—без портфэля —Я. Варонка, Сэкрэтар фінансавых спраў С. Хжонсовскі, Сэкрэтар народнай прасьветы П. Алексюк і загадчык справаў Народнаго Сэкрэтарыяту Аўсянік.

Голас ваенна-палонных.

Рэдакцыяй літэратурна-палітычнаго тыднёвіка «Вольная Беларусь» атрыманы ліст такога зьместу:

«Лангельзальца 28, III, 1918.

Горад Менск — Беларускі. Захароўская вул. № 18. Яго міласьці п. Лёсіку.

Шаноўны Пане Рэдактару!

Гэтым гонар маем найпакорней прасіць аб высылцэ Вашай паважанай часопісі «Вольная Беларусь», бо у нашым абозе шмат беларусаў, якія іщчэ у 1905—6 г.г. выпісывалі з Вільні газэту на сваёй радной мове— «Нашу Ніву», выдаўцом каторай быў п. А. Уласаў.

Споўняючы волю нашых прасіцеляў мы іщчэ раз просім ні пакінуць ні без Вашай зычлівай увагі і гэтым аблягчыць іх цяжкі стан. Спадзяючыся на атрыманне у хуткім часе паважнай Вашай часопісі просім прыняць нашае прывітанне і запэўненне ў поўным зауфанню да Вас нашых таварышаў.

С шчырай пашанаю

Старшыня Камітэту А. Кузнецоў.

Віцэ-старшыня Васілі Караліцкі.

Дзелавод —(ні чытэльна).

На лісьце штэмпэль: «Русскій Комитет лагеря в.-плѣнных Лангензальца. Германія».

Агульныя весткі.

КІЕУ, 13/V. Украінскі урад прышоў да згоды з расійскім урадам аб тым, каб мірныя умовы паміж абедзьвамі дзержавамі вяліся ні у Курску, але у Кіеві. Дэлегацыі з абедзьвых старон у хуткім часі зьбяруцца у Кіеві.

БЭРЛІН, 13/V. Адна з нашых падводных лодак, якія знаходзяцца у Фляндрыі пад камандай обэр-лейтэнанта у моры, затапіла зноў пад час стогадзіннай апэрацыі на усходняй часьці каналу Ля-Маншэ, пры найвастрэйшых контр-дзеях праціўніка, сем ўзброенных паровых караблеў у ліку 22,500 тбр.

Паміж імі два дарагія караблі па 5000 тон узброеныя некалькімі гарматамі. Караблі былі, апрача аднаго, глыбока нагружаны; Як мы пэўна ведаем, яны вазілі большасьцю, ваенныя прыпасы для непрыяцеля. Апэрацыя здольнаго камандзіра прэдстаўляе карысную чыннасьць.

Шэф Адміралтэйскаго штабу.

БЭРЛІН 13/V. «Норд. Альгем. Цэйтунг» паведамляе: у эканамічна-палітычным дагавору, што Нямеччына утварыла з Румыніяй і што датычыцца вядомаго ужо праўна-палітычнаго трактату, важны дадатак да Букарэцкіх мірных умоваў, варта адзначыць некалькі цікавых прыпіскоў.

Адна з іх даець немцам гарантыю, якой яны ўжо абязпечылі сябе у другіх мірных трактатах з усходнымі народамі, што Румынія ні прымець ніякога учасьця ні у якой кольвек эканамічнай вайне проціў Нямеччыны. Другі пункт, быўшы ўжо у Бярэсцкіх мірных умовах, запоўняе Нямеччыне мажлівасьць увайсьці з ею у таможна-палітычныя блізкія зносіны. Далей аднято у Румыніі право, экспорт-таможны налог на яе нэфтаныя прадукты.

У рэшці трактат дапаўняе згоду аб мажлівасьці купляць немцам румынскія землі. Па гародах немцы маюць роўныя правы з румынамі у зьвязку з ўласнасьцю у той час, калі на вёсках яны могуць арэндаваць зямлю толькі на 30 гадоў. Гэта арэндаванне можа двойчы прадаўжацца на гэтакі самы срок. Нямецка-румынскі гандлёвы трактат 1905 г. уходзіць зноў у моц да 1930 г. з дабаукамі розных паляпшэнняў для немцаў. У другой часьці трактату немцы абезпечываюцца ад непаразуменняў у жалезнадарожнай камунікацыі і румынскія жал.-дарожныя тарыфы адмежаваны дзеля таго, каб тарыфная палітыка ні магла пашкодзіць зносінам з Нямеччынай. Што тычыцца тэлеграфнай комунікацыі то Румынія абезпечана для немцаў як транзітная страна для нямецкай прамысловасьці з Усходам і Поўдня—усходам. Да 1950 г. немцы маюць у Румыніі кабэльны манаполь, прывілегія, якой дагэтаго часу карыстала Англія у кожнай старане.

Асобую увагу звертае на сябе спэцыяльны эканамічны дагавор паміж Нямеччыны і Румыніяй. паводлуг якого немцы абезпечаны лішкай харчовых прадуктаў у Румыніі за умераныя цэны.

Весткі з Расіі.

МАСКВА (П.Т.А.). На аснове агульнай амністыі выпушчаецца вялікая лічба палітычных і іншых праступнікау каторыя цяпер знаходзяцца у турмах. У Пецярбурзе асвабоджэны быушыя міністры Романова і Керэнскаго.

Ні асвабаджэны толькі праступнікі за гасударственую здраду і абман. Пурышкевіч і іншыя учасьнікі загаворау проціу рад усяго 200 чал. выпушчэны.

З Валікаросіі атрымана дужа забрытаная й трудна зразумелая радіо-тэлеграма з Масквы. Спачатку гаварыцца аб тым, што савецкая ўлада знаходзіцца ў вельмі крытычным становішчу, для збавення ад якога патрэбен экапамічны пад'ем стараны й соцыялістычная армія. Да гэтых час ўдалося скасаваць уласнаць капіталістаў й адабраць ў іх меппе, але прыкладваная дасюль ўрадам сіла, аказалася занадта слабаю. Павінна вымагацца безумоўная пакорнасьць. Лёзунгам мамэнту зьяўляецца дыктатура пролетарыяту. Урад, мусі, праканаўся, што з бандамі чырвоная гвардзіі нічога ні выходзіць. Праз гэту прычыну чырвонай гвардзія касуецца й робіцца спроба стварыць чырвоную армію з афіцэрамі даўнейшай царскай арміі. Нраскольні гэто удасца— нівядома. Аб выразных рэзультатах да гэтых час нічога ні паведамлялося.

Галодныя бунты.

Як паведамляюць маскоўскія газэты ад 11-г. м., у ваколіцах Петраграда і у самым горадзе падымаюцца стыхійныя бунты с прычын харчовай нідастачы. Апошнімі днямі у Колпіне і Сестрорэнцы пры такіх безпарадках вельмі пабілі членаў савецкай харчавой арганізацыі. На заводзкім сабранні у Сестрорэнцы білі прэдстаўнікаў харчовай управы нават і рабочыя-большэвікі. Заводзкае сабранне адправіло дэлегацыю у Смольны с патрэбаваннем хлеба. Зіноўеў абецаўся даць 200 пудоў, але дэпутацыя тут жа у Смольным здабыла 400 п. Чырвоная армія пачала усё-ж такі арэштоўваць рабочых. А у Колпіне, у часе харчовых безпарадкаў, стрэлялі у народ с куляметаў па загаду старшыні харчовай управы.

Камісар Бутырскай турмы Кавалеў арэштован і прэдан суду рэвалюцыйнаго трыбуналу. Яго вінавацюць у тым, што ён асвабаджаў арэштаваных. Сьледство пацьверджае, што Кавалеў ад кожнаго арэштованаго меў гонарару 500—600 руб.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 16 мая 1918 року.

З А Х А Д: Па сканчанню сягоннящіх пяхотных баёў паўночней Кэммэлю, ў якіх мы адкінулі французаў, прарваўшыхся ў адным мейсцу, артылерыйскі агонь аслабеў. На другіх баевых фронтах артылерыйская чыннасьць так сама павальнейшая. Моцныя агневыя дзеі проці нашых пяхотных і артылерыйскіх пазыцыяў працягваліся па абодвых баках каналу Ля-Бассэ, а так жа міжы Соммаю і Аўраю. На заходным беразі ніпрыяцель павеў атаку с Сенекацкаго лесу вялікімі сіламі. Яна была адбіта с цяжкімі для ніпрыяцеля стратамі. На рэшці фронту нізначныя схваткі.

Дужы напад лятуноў давеў да шмат надземных перамогаў Мы зьбілі 33 ніпрыяцельскіх аэропляны, з якіх 14 былі скінуты тою эскадрыллею, якою раней рукаводзіў ротм. барон Рыхтгофэн. Лейтэнант Віндыш здабыў сваю 20-ю надземнаю перамогу.

З іншых тэатраў вайны ніякой навіны.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Па Ліб. Ром. ж. д. павядамлено: выезжаючых адгэтуль агентау у Маскву, у раду камісарау, большэвікі ад Вялікадня перасталі прымаць на другія калеі,—вельмі перапоўнено. Апрача таго, Л. Р. ж. д. аставіушых на ей службу, агентау другі раз ні прыймае ніхай гэта памятаюць тыя, якія думаюць ехаць у Маскву.

У «У. З. С.» шмат з б. агэнтау тэхнастроя, зьездзіушы у Маскву у Цэнтральны Земгорскі Камітэт с «обязательствами» па ліквідацыйныя, атрымалі замест 1,200—8000 руб. толькі 400 руб. «Обязательства» на рэшта грошай ні выдавалі.

І пан добры і рахунак добры!

Вялікая грамада уцекачоу (каля 10,000 чал.) накапілася апошнімі днямі у Оршы; яны напрауляліся з унутрэных часьцей Расіі—праз Менск у Літву і Польшчу і затрыманы часова дзеля уладжывання больш строгаго парадку перэправы.

Паравозныя брыгады мейсцовых жел. дар. прыймаецца нямецкай уладай, пры жаданні, на службу у Прыбалтыйскі край, а глаунае у Рыгу.

У казеннай рэяльнай школе, пасьля Вялікоднаго перарыву заняцця, зноу пачаліся сумныя гісторыі з выкідываннем вучнеу,—ні уплаціушых грошай за правоучэнне. Вялікія аклады пэрсоналу (7,000--10000 руб. у год) гэта нешта нейкае ды знача і тут ужо ні памагаюць ніякія цяжкія варункі апошняго часу.

Сярод арэндатарау на землях менскаго жаноцкаго манастыра павялічэнне ставак пры новых дагаворах цяпер вельмі востра чуецца: замест 20 к. за кв. сажэнь даходзіць да 40 к. і г. д.

Апрача таго, зноу увайшло у моду вымаганне гонарару (па 100 р. і болей) за перэуступы пляцоу адным арэндатарам другому.

Усяго арэндатароу на землях жаноцкаго манастыра лічыцца да 15. Гэты пляц абхопліває вялікую часьць местовых ваколіц «Уборак» і «Добрых Мыслей».

Юбілейны дом на будучы тыдзень пераходзіць да Беларускай Рады.

Інвэнтар і б. упраулення менскаго почт,-тэлеграфнаго округа часьцямі атпраулен у г. Краснае Смаленскай губ.

Членам афіцэрскаго бюро ні менскім уражэнцам ні маючых заняцця, жывучым на нямецкі паек і пэнсію, ад 1-го чэрвеня будзе прапанавано выехаць. дзеля таго, што, згодна вывешэнай у бюро абвесткі, ад гэтаго дня усе яны, а так-сама ваенныя дахтары чыноунікі, ваенна-палоннымі ні лічуцца.

Цэны на Троіцкім пляцу за сераду 15-го мая:

Дровы — 20 25 р. воз.

Асобы, прыезжаючыя з Благавешчэнска, перэдаюць што там:

Хлеб (белы)	20 к.	ф.
Мясо — —	25 к.	»
Рыба — —	10 к.	»

Пытанне а вэзстаноуленні страіцэльнаго аддзела б. губэр. праулення (разагнана большэвікамі), ні, так дауна быушае на чародзе, цяпер заціхло, глауным чынам с прычын сьмерці галавы аддзела—інжэнэра Гекторьеускаго.

А між тым брак страіцельнаго у губэрні органа па дагляду за нарушэннем страіцельнай уставы чуецца цяпер вельмі востра, бо па усяму гораду раскіданы, без усякаго пляну і дазору, земсаюзныя, сагорскія і іншыя баракі, якія гарэць ва усю. А гэта каштавала ні мала народных грошай.

Курсы беларусазнаўства.

17 мая лекцыя Ст. Лянкоускаго. «Гісторыя беларускаго права».

Пачатак а 7 гадз.

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтво Т-во «Заранка».

Друкарня Я. А. Грынблята.